Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2015 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках Дня абароны дзяцей

***3 чэрвеня***

Адбылося свята для дзяцей «Пусть будет мирным небо над землёй, пусть вечно детство звонкое смеётся». Дзеці школьнага лагера СШ №6 прынялі актыўны ўдзел у конкурсна - гульнёвай праграме «Почитаем, поиграем, отдохнём и время с пользой проведём». Прысутныя з цікавасцю паглядзелі лялечны спектакль па матывах казкі Г.-Х. Андэрсэна «Дюймовочка».

*ДБ, 20 чал.*

***3 чэрвеня***

Гульнёва-пазнавальная гадзіна «Летом некогда скучать, книжки будем мы читать». На мерапрыемстве дзецям прапанаваны розныя конкурсы: конкурс малюнкаў «Детству солнце подарите», конкурс загадак «Мой вопрос-Ваш ответ», а таксама розныя рухомыя гульні. Па выніках кожнага конкурса пераможцы атрымалі салодкія прызы.

*Шамятоўская СБ, 23 чал.*

***4 чэрвеня***

Сумесна з Домам культуры, школай мастацтваў, Домам рамёстваў арганізавана свята чытаючага дзяцінства «Не прожить на белом свете без любимых книжек детям». У праграме: гульні, конкурсы, віктарыны, песні, танцы. У выкананні дзіцячай вакальнай групы прагучалі песні: «Мир без войны», «Хочу в деревню», «Если с другом вышел в путь» і інш. Навучэнцы школы мастацтваў выканалі танцы: «Терем-царевна», «Три подружки», «Чёрно-белое», «Бескозырка белая».

*Дзівінская ДБ, 30 чал.*

***4 чэрвеня***

Праведзена гульнёвая праграма «Складаем казку самі». Маленькія чытачы падзяліліся ўражаннямі аб прачытаных кнігах і любімых кніжных героях, прынялі актыўны ўдзел ў гульнях «Да, нет», «Это я, это все мои друзья», адгадвалі загадкі «Хто героі гэтай казкі» . Не толькі дзеці, але і бацькі з задавальненнем прысутнічалі на мерапрыемстве.

*Гарадзецкая СБ, 21 чал.*

***14 чэрвеня***

Свята дзяцінства «Детству солнце подарите». Для дзяцей падрыхтавана гульнёвая праграма, на якой яны адказвалі на пытанні віктарыны, адгадвалі загадкі, гулялі ў цікавыя гульні, выконвалі вясёлыя песні з мультфільмаў. Да ўвагі прысутных прадстаўлена кніжная выстаўка «Девчонки и мальчишки, читайте летом книжки».

*Балоцкая СБ, 16 чал.*

## Мерапрыемствы ў рамках праграмы летняга чытання «Летом с книгой я дружу»

***5 чэрвеня***

Ў рамках праграмы летняга чытання «Летом с книгой я дружу» прайшла літаратурная завалінка «Чтение под настроение». Адбылося займальнае падарожжа «Возьмите книгу в руки, дети» з прываламі на станцыях «Загадочная», «Книжкин вопрос», «Город сказочных героев». Малодшых школьнікаў запрасілі паўдзельнічаць у гульнёвай пазнавальнай праграме па казках «Гэтыя цудоўныя казкі» у форме прэзентацыі з элементамі віктарыны.

*Стрыгаўская СБ, 15 чал.*

***17 чэрвеня***

Адбылося бібліятэчнае асарці «Ура! Лето! Идём в библиотеку!». Дзеці са школьнага лагера прынялі ўдзел у конкурсе «Летнія прыкметы», віктарыне «Чароўныя казкі», гульнёвай фальклорнай праграме «Мясцовыя пацехі». Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі дыпломы і прызы.

**Іншыя мерапрыемствы**

***1 чэрвеня***

У рамках інфармацыйна - адукацыйнай акцыі «Брестчина без табака» прайшла інфармацыйная гадзіна з відэапрэзентацыяй «Курить уже не модно». Прысутныя пазнаёміліся з шкодным уздзеяннем на чалавека нікаціну, курыльных сумесяў - «спайса». Навучэнцы 6 -7 класаў атрымалі памяткі пра шкоду курэння і ў якасці бонусаў з пажаданнямі здароўя і добрага настрою - цукеркі.

*Лукская СБ, 15 чал.*

***2 чэрвеня***

70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне прымеркавана пашыранае пасяджэнне клуба «Золотые годы» «Вайна трывожыць нашы душы» сумесна з клубамі «Сустрэча» і «Залаты век». «Катюша», «У зямлянцы», «Синий платочек» і іншыя легендарныя песні прагучалі ў выкананні гасцей і работнікаў бібліятэкі. Разам з кадрамі ваеннай кінахронікі, франтавымі фатаграфіямі, ўспамінамі удзельнікаў сустрэчы аб сваім ваенным дзяцінстве, вершамі Мусы Джаліля, Юліі Друнінай, Леаніда Глушко прысутныя стваралі адпаведную атмасферу тых далёкіх франтавых гадоў. У канцы праграмы прадастаўлены свабодны мікрафон, дзе кожны жадаючы змог праявіць свае таленты і здольнасці.

*ЦБ, 62 чал.*

***8-14 чэрвеня***

Прайшоў Тыдзень праваслаўнай кнігі «Родна і праведна праваслаўнае слова», у ходзе якога чытачам бібліятэкі прапанавана праваслаўная літаратура і кніжная выстава «Святло праваслаўнай кнігі».

*ЦБ*

***17 чэрвеня***

Сярод супрацоўнікаў ЦБС праведзены кірмаш творчых ідэй «Летнее чтение с увлечением» . Сельскія бібліятэкары падзяліліся з калегамі вопытам арганізацыі бібліятэчных мерапрыемстваў у перыяд летніх канікул , прапанавалі новыя формы прапаганды кнігі і чытання сярод дзяцей і падлеткаў. Гэта і святы бібліятэчнага двара, і літаратурныя лаўкі, і кніжнае лата, гульні, конкурсы, віктарыны і г.д.

*ЦБ, 76 чал.*

***25 чэрвеня***

Сумесна з супрацоўнікамі СДК на адкрытай пляцоўцы адбыўся ўрок мужнасці «Завтра была война». У праграме мерапрыемства: кніжная выстава «В книжной памяти мгновения войны», прагляд буктрэйлера па творах Б. Васільева «А зори здесь тихие…», конкурс выразнага чытання вершаў пра вайну «Мы о войне стихами говорим». Удзельнікі мерапрыемства атрымалі граматы і падарункі.

*Шамятоўская СБ, 60 чал.*

***25 чэрвеня***

Сумесна з Хідрынскім СДК прайшоў квэст па матывах фільма «Пираты Карибского моря». Бібліятэкар выступала ў ролі захавальніцы кніг і правяла з дзецьмі конкурсы загадак і ітэлектуальную гульню «Хочу всё знать». У квэсце удзельнічалі 3 каманды. Іх

галоўнай задачай з'яўлялася знайсці страчаны карабель Джэка Вераб'я і ўзнагароду. На фінішы кожнай камандзе трэба было збудаваць свой пірацкі сцяг і дабрацца да карабля, каб атрымаць запаветны скарб.

*Хідрынская СБ, 50 чал.*

Выканаўца
Мілашук Т. І.
ОБМ
2-36-81